Просто хорошая газета

Отдушина

12+

№27 (774) 3 июля 2019 года

Выходит один раз в неделю | Основана 18 октября 2002 года | Издатель УП «Газета Слонимская» | ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

ОСОБЕННОСТИ ПРОФЕССИИ

Жизнь на колёсах Полины Мелешко

Профессия проводника поезда считается одной из самых интересных, но и самых сложных.

Полина Мелешко

Помимо романтики дорог — постоянной смены пейзажей за окном, новых знакомств — здесь все: ответственность за пассажиров, обеспечение их комфорта.

21-летняя Полина Мелешко из Слонима с детства мечтала стать стюардессой, но, к сожалению, не подошла по параметрам. «Так пришло решение немного поменять сферу деятельности. Я не совсем отступила от своей мечты, стала стюардессой стальных магистралей, — рассказывает Полина. — Когда-то я окончила девять классов в средней школе №5, а 10-11 классы — в районном лицее. Мои школьные годы, как у всех, наверное, были самыми беззаботными и счастливыми. Из школьных предметов больше всего мне нравился русский и английский языки. Я училась, выбирала профессию, в итоге все-таки остановившись на профессии проводницы поезда. С уверенностью могу сказать: это мое».

Плюсов у выбранного Полиной дела достаточно: путешествия, новые впечатления. «Конечно, все это дает силы работать. Мне нравится, что я занимаюсь любимым делом. Но и сложностей, конечно, хватает. Как ни крути, это работа не из легких, — рассказывает Полина. — Причем сложно не только в моральном плане, но и физическом. Проводница — это не просто красивая униформа и дефиле по вагону, это круглосуточная ответственность за людей. Помимо всего, в обязанности входит работа со всем техническим оборудованием поезда: водоснабжением, вентиляцией, электричеством, а также санитарная обработка. Мы также должны уметь оказать медицинскую помощь, помочь при оформлении документов (если состав пересекает границу). Пассажиры у нас бывают разные, не всегда с хорошим характером и настроем. И нам надо всем угодить, порой невзирая на откровенную грубость и хамство».

Плохое забывается, когда маршрут хороший: «За время своей работы мне уже удалось немного попутешествовать. Я была в Украине, Сибири, России. Много городов проехали. Конечно же, самым запоминающимся и любимым является маршрут с остановкой на море — я была в Анапе, Адлере. От таких поездок получаешь настоящее наслаждение: море, солнце, жара», — рассказывает Полина.

Полина на рабочем месте

В данный момент девушка ездит в Москву. «Пока что я не устала от своей профессии, мне нравится. Моя мама очень рада за меня, она только «за», что я не занимаюсь монотонной работой. Да и мой молодой человек с пониманием относится к поездкам, он тоже работает в этой сфере. Очень важно в жизни заниматься тем, что нравится. Я могу считать себя счастливым человеком», — говорит Полина.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ФОТО ИЗ ЛИЧНОГО АРХИВА ПОЛИНЫ МЕЛЕШКО

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-000, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Хто цікава распавядзе пра герояў фотаздымкаў — атрымае запрашальны квіток на дзве персоны на спектакль Слонімскага драмтэатра.

Узімку ў Слоніме

На фотаздымак працаўніц колішняй слонімскай фабрыкі «Тэкстыльшчык», надрукаваны ў №26 «Аддушыны», адгукнулася наша чытачка Лілія Мандрыкевіч.

— Першая злева на здымку — Ліда, запамятавала, як яе прозвішча. Другая — Зіна Максімава, яна ўжо памерла. Трэцяя — Валя Шлемен, жыве ў Слоніме. Чацвёртая — Лена Казак і пятая — Галя Мышко, — расказала пра сваіх былых калежанак Лілія Дзмітрыеўна, якая 19 гадоў адпрацавала на «Тэстыльшчыку».

Сваю цётку Лідзію Сцяпанаўну Блошка (першую злева) таксама пазнаў наш чытач Пётр Дзямянчык. Па словах Пятра Дзмітрыевіча, яго цётка памерла 3 ліпеня 2016 года. Траіх герaінь пазнаў таксама Уладзімір Рабцэвіч.

Нашы чытачы Цімафей Макоўскі, Ірына Імбіцкая, Фелікс Лукашэвіч, Святлана Ёрш, Ігар Іўчанка, Алена Жукоўская і Алег Спацюк атрымаюць запрашальныя квіткі на прэм`ерны паказ спектакля «Нязваны госць», які пакажуць у нядзелю, 7 ліпеня.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

ФУТБОЛ. ПЕРВАЯ ЛИГА

Слонимчане упустили победу в добавленное время

30 июня «Слоним-2017» сыграл вничью в выездном матче со «Сморгонью» в рамках 12-го тура чемпионата Беларуси по футболу.

Борьба за мяч

Футбольный клуб «Сморгонь» расположен на 14-м месте в турнирной таблице. «Слоним-2017» по-прежнему находится на 13-й строчке. Этот матч был принципиален для обеих команд, и никто не собирался уступать.

Первым счёт открыл соперник — Владимир Козко на 12-й минуте с пенальти забил гол в ворота слонимчан.

Нашим футболистам удалось отквитать мяч — Артур Тишко забил гол за минуту до перерыва.

Во втором тайме Вадим Спасюк на 48-й минуте поразил ворота «Сморгони».

Долгое время слонимчане удерживали счёт 2:1. И многие болельщики Слонима ожидали победу. Но под занавес игры на 1-й добавленной минуте (из четырех) сопернику удалось сравнять счёт. Гол в ворота слонимчан забил Денис Гружевский. Матч был завершен со счётом 2:2.

Кристина СОЛОДУХО
ФОТО SHLIAH.BY

ФУТБОЛ. КУБОК БЕЛАРУСИ

«СЛОНИМ-2017» ПРОИГРАЛ «ВИТЕБСКУ»

В рамках квалификационного раунда Кубка Беларуси 26 июня «Слоним-2017» сыграл против «Витебска».

Матч состоялся на слонимском стадионе «Юность». Гол в ворота слонимчан был забит уже на второй минуте игры. Автором гола стал Владислав Рыжков. Второй гол слонимский вратарь Дмитрий Сай пропустил в конце первого тайма.

Третий мяч залетел в ворота слонимчан на 51-й минуте. Слонимчанам удалось забить гол в витебские ворота на 87-й минуте. До конца матча счет не изменился. «Слоним-2017» проиграл кубковую встречу со счётом 3:1.

Стартовый состав на игру: Дмитрий Сай, Марк Усович, Денис Воскобойный, Георгий Читанава, Сергей Кучмель, Артур Тишко, Андрей Стрижеус, Евгений Баль, Евгений Заборонько, Иван Кириченко.

На замену выходили во втором тайме — Владислав Берг, Дмитрий Хмельницкий, Олег Герасимчик, Владимир Харланов, Влад Борисенко.

Голы: Рыжков (2`), Федосов (42`), Нурисов (51`), Тишко (86`).

Критсина СОЛОДУХО
ФОТО АВТОРА

Момент игры

Веломарафон «К Разбитому камню» собрал полторы сотни участников

В воскресенье, 30 июня, в микрорайоне Альбертин, у бывшего поместья графа Пусловского, было многолюдно — велосипедисты со всей Беларуси приехали в Слоним, чтобы принять участие в веломарафоне «К Разбитому камню».

Организатором веломарафона выступил клуб велосипедного спорта и туризма «ВелоСлоним». По словам руководителя клуба Вячеслава Адасика, более 140 человек попробовали свои силы на непростом маршруте.

Открыли мероприятие самые маленькие участники марафона. Дети проехали 500 метров под бурные овации зрителей.

Потом стартовали взрослые на дистанции 10, 30 и 62 км.

Трасса веломарафона, по словам многих участников, была довольно интересной — крутые подъемы, узкие лесные тропинки, гравийка, старый деревянный мост... У каждого была возможность испытать себя.

Ольга ШИНКЕВИЧ
ФОТО АВТОРА
БОЛЬШЕ ФОТО НА GS.BY

Поехали!


Перед стартом


Моменты марафона

Через камень

Впереди — 10 км маршрута

Наградили малышей

Слонимчане воплотили свою детскую мечту — сделали плот и отправились в путешествие

Шестеро слонимчан — Дмитрий и Давид Кравченко, Евгений Евхута, Андрей Бушмакин, Дмитрий Иванов, Максим Бондаловский — своими руками сделали плот и отправились на нем в небольшое путешествие.

На плоту

«Кажется, что у всех мальчишек в детстве есть такая мечта: на плоту плыть по реке. Вот и мы не стали исключением, а воплотили в жизнь свои желания, — рассказывает Дмитрий Кравченко. — У нас были технические возможности: имелись доски, канистры, тент сняли с машины. Именно поэтому плот обошелся нам не очень дорого».

Друзья-товарищи собрали из подручных средств плавсредство, обжили его — поставили мягкий уголок, кресло. «Получилось довольно комфортно. Прямо на плоту мы готовили себе поесть. Также у нас был генератор, который вырабатывал электричество, поэтому мы не сидели без света», — говорит Дмитрий.

Все предусмотрев, слонимчане отправились по Щаре к Неману. «Наше небольшое путешествие продлилось три дня. Если честно, то думали, что будет легко, но в некоторых местах реки управлять плотом было довольно затруднительно. Есть такие совершенно дикие отрезки, где свалены деревья. Здесь пришлось толкать, переносить наш плот, чтобы выплыть», — рассказывает Дима Кравченко.

Ночью слонимские путешественники не плыли, они устраивали привал на берегу. Кто-то ночевал в палатке, а кто-то на плоту. «Мы увидели завораживающие по красоте места — природа нашего края очень красивая. Удивляло то, что у нас много оборудованных для отдыха мест, были и походные бани, которыми можно пользоваться без спроса, — говорит Дмитрий. — В воскресенье мы приплыли в Мосты, хотели и дальше сплавляться, но встречный ветер прервал наше путешествие».

Друзья остались довольны своим приключением. Детские мечты сбылись!

Ольга ШИНКЕВИЧ
ФОТО ИЗ ЛИЧНОГО АРХИВА ДМИТРИЯ КРАВЧЕНКО

У памяць пра рэдактара Віктара Уладзіміравіча Валадашчука

Здаецца, толькі ўчора гэта было: першы артыкул, першы ганарар, першы рэдактар. Той, каго магла б назваць Настаўнікам, але неяк так хутка бег час, так хутка пісаліся артыкулы, выдаваліся нумары, так хутка змяняліся абставіны, што толькі пачала думаць пра той шлях, што прайшла за гэтыя гады, а падзякаваць за тую першую навуку ўжо і няма каму...

Колькі разоў праязджаючы побач з рэдакцыяй, думала: мо зазірнуць? І хоць месца ўжо было не тое, і хоць людзі таксама часткова змяніліся, яна была тым гняздом, у якім гадавалася, у якім стала птушкаю.

Памятаю, як трапіла туды. Амаль з вуліцы.

Памятаю першы артыкул. І першую фатальную памылку. Памятаю, як першы раз дазволілі быць дзяжурнай па нумары. Пах друкарскай фарбы. Вёрстку да ночы. Батон і каўбасу, якую Віктар Уладзіміравіч прыносіў нам, каб падсілкаваліся, калі заседжваліся.

Вось толькі ўчора яшчэ магла б за ўсё гэтае падзякаваць, а сёння — ужо не. Дзікунства. Немагчыма паверыць і змірыцца. Здавалася б, столькі ўсяго перажыў, столькі абставін пераадолеў, такое выданне дзесяцігоддзі цягнуў на плячох, нібы той тытан. Здавалася, яшчэ горы зверне. Але лёс няўмольны. Лёс такі, што ніколі не ведаеш, колькі там адмерана, на Нябёсах. Колькі засталося. Колькі наканавана.

Мо так і лепей, што не ведаеш. Бо проста ідзеш сваім шляхам. Робіш тое, ува што верыш. Гадуеш дзяцей, працуеш, вандруеш, вучыш іншых і бясконца вучышся сам.

Мо так і лепей... Але не. Не для тых, хто застаецца. Бо колькі ўсяго б сказала... За колькі б падзякавала. Асабіста, гледзячы ў вочы.

За чалавечнасць, за добразычлівасць, за прафесійнасць. За тое, што бараніў. За тое, чаму навучыў. За тое, што даравай.

Кажуць, час такі — ніхто на вяселлі ўжо не заве, усё больш — на развітанні, на хаўтуры. І трэба змірыцца. Зразумець, што так яно, жыццё, пабудаванае. Сустрэчы і расстанні. Развітанні і апошні шлях.

Але калі чалавек пакінуў пасля сябе столькі спраў, столькі вучняў, столькі аднадумцаў, ці можна лічыць гэты шлях апошнім?

Хай Нябёсы будуць міласцівыя да Вас, Віктар Уладзіміравіч... Як Вы былі міласцівыя да нас.

Яніна МЕЛЬНІКАВА,
mediakritika.by

ЯГОНАЯ ГАЗЕТА ВАРУШЫЛА СЛОНІМ

Трапіць на працу ў «Газету Слонімскую» Віктара Валадашчука ў пачатку 2000-х для мяне было як сёння атрымаць запрашэнне ў New York Times.

...Памёр рэдактар першай газеты, дзе я пачаў працаваць, калі яшчэ вучыўся ў 9-м класе.

У 1997 годзе былы карэспандэнт дзяржаўнай раёнкі Віктар Валадашчук адкрыў «Газету Слонімскую». У канцы 1990-х і пачатку 2000-х яна не давала спакою нікому. Яе баяліся чыноўнікі ад Слоніма да Менску, бо гэта было самае ўплывовае выданне ў рэгіёне. Газету шчыра любілі людзі, бо яна была пра людзей. Выданне задавала рытм гораду, варушыла Слонім. Я памятаю часы, калі яе наклад даходзіў да 12 тысяч асобнікаў. І гэта ў 50-тысячным Слоніме.

Улады доўга спрабавалі разабрацца з газетай, бо Слонім быў сярод рэдкіх гарадоў, дзе раёнка мела мізэрны наклад у параўнанні з незалежнымі выданнямі.

Трапіць туды на працу было чыстай марай. Быць журналістам «Слонімскай», як кажуць у нас, было больш чым прэстыжна. Віталіка Гіля пазнавалі здалёк па фотаапараце. Ягоную бараду ведаў увесь горад. Самыя стылёвыя матэрыялы Волі Шынкевіч абмяркоўвалі ў школах і вучаніцы, і настаўніцы. Кожны артыкул Сяргея Чыгрына быў як гістарычнае расследаванне. Потым тыя артыкулы развіваліся ў кнігі. Парадак дня вызначаў астраўскі аднакласнік майго бацькі, а тады адказны сакратар Мікола Кананові. Адзін Валера Каваленка, а потым Саша Захаранка замянялі слонімцам цэлы «Прэсбол». Яны былі першымі спартовымі журналістамі, каго я рэгулярна чытаў. Хоць і бачыў усе матчы нашай «Камуны», на якія таксама хадзіў.

ФОТА З АРХІВА «ГС»

На чале з галоўным рэдактарам Віктарам Валадашчуком. Рэдакцыя «Газеты Слонімскай» узору 2017 года

Усё гэта стваралася на цесным другім паверсе быткамбінату на Камсамольскай, дзе доўгі час месцілася рэдакцыя. І калі пасля «Школы маладога журналіста» ў 9-м класе мне сказалі: «Прыходзь да нас працаваць» — я не мог паверыць у прапанову. Працаваць у «Слонімскай» на той час для мяне — гэта як цяпер атрымаць запрашэнне ў New York Times. Не менш. Толькі дзякуючы працы ў газеце я змог паступіць на журфак. Вусны іспыт завальваў, але Барыс Васільевіч Стральцоў, паглядзеўшы на тэчку з сотняй публікацый, сказаў: «Раз чалавек працуе, яму месца на журфаку». І паставіў 5 з 5. Роўна столькі мне трэба было набраць, каб паступіць на бюджэт у той год.

Ужо на журфаку я зразумеў, якую крутую школу журналістыкі дала «Слонімская». Пакуль мае аднакурснікі пісалі сачыненні ў «Переходный возраст» і чакалі месяцамі апублікавання, мае навіны і рэпартажы штотыдзень праходзілі праз тэкстадрабільных Сяргея Чыгрына і Віктара Валадашчука. І пасля двух гадоў у газеце ўжо не было чаму вучыцца на журфаку.

Дзякуй за ўсё, спадар Віктар.

Антон ТРАФІМОВІЧ,
«Радыё Свабода»

ЧАС ВІКТАРА ВАЛАДАШЧУКА

Не стала Віктара Валадашчука — заснавальніка і галоўнага рэдактара «Газеты Слонімскай», неабыякавага чалавека, шчырага беларуса.

Нам яшчэ належыць асэнсаваць феномен «ГС» як грамадска-палітычнага чынніка Слонімшчыны, феномен супольнасці слонімцаў, якія ў 1997 годзе падтрымалі праберларускі, праеўрапейскі выбар газеты, падтрымалі выбар Віктара, які ён зрабіў яшчэ ў 1994 годзе, калі быў журналістам раённай газеты «Слонімскі веснік».

У дзяржаўнай газеце яму былі гарантаваны праца і досыць спакойнае, бесклапотнае жыццё з рэальнай перспектывай стаць галоўным рэдактарам, адно пішы «правільна». Пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года і ўсталявання так званай вертыкалі ўлады дадалася яшчэ адна ўмова — не пісаць у незалежныя газеты.

Менавіта тады Віктар Валадашчук зрабіў свой выбар — пачаў працаваць у Менску ў незалежнай недзяржаўнай газеце «Свабода», а ў 1997 годзе заснаваў «Газету Слонімскую».

Бывае, чалавек апраўдвае сваю слабасць, свае няпэўныя кампрамісы словамі «такі час...». Але, лічу, якія мы, такі і час! Для Слонімшчыны час найбольшага ўздыму «Газеты Слонімскай» — гэта Час Віктара Валадашчука. Светлая памяць!

Міхась ВАРАНЕЦ,
ГА «Воля да развіцця»

ПАМЁР БЫЛЫ АРТЫСТ СЛОНІМСКАГА ТЭАТРА ВІКТАР ШЧАРБАКОЎ

Днём у пятніцу, 28 чэрвеня, на 91-м годзе жыцця памёр адзін са старэйшых артыстаў Слонімскага драмтэатра, Віктар Шчарбакоў.

Віктар Шчарбакоў

— Летась 16 лістапада мы адзначылі 90-годдзе Віктара Міхайлавіча. А вось сёння прыйшла ў тэатр сумная вестка, што яго не стала, — сказаў у размове з карэспандэнтам «ГС» галоўны рэжысёр тэатра Васіль Сявец.

Як адзначыў Васіль Сявец, на пенсію старэйшага артыста тэатра яны праводзілі недзе восем гадоў назад.

У свой час, адказваючы на пытанне нашага карэспандэнта, што для вас шчасце, Віктар Шчарбакоў адказаў, што шчасце — гэта ў першую чаргу сям`я, праца і любімае захапленне.

Рэдакцыя «Газеты Слонімскай» спачувае блізкім і былым калегам Віктара Міхайлавіча. Вечная памяць.

Біяграфічная даведка

Віктар Шчарбакоў нарадзіўся ў Маскве 16 лістапада 1928 года. У раннім узросце пераехаў жыць у горад Стрэльна Ленінградскай вобласці. Вучыўся ў культпрасветвучылішчы. Працаваў на Поўначы на заводзе электразваршчыкам. У Слонім прыехаў у 1959 годзе. Быў загадчыкам сельскага клуба. У кінатэатры «Мір» працаваў спачатку слесарам-электрыкам, потым адміністратарам і, нарэшце, дырэктарам. Па запрашэнні галоўнага рэжысёра тэатра Мікалая Варвашэвіча ў 1989 годзе стаў артыстам Слонімскага драмтэатра.

Мікола КАНАНОВІЧ

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ АНТОНА РАВЕЙКІ

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Карову трэба прадаваць, бо колькі ўжо можна цягнуць з сябе жылы! — рашуча сказаў сваёй Марусі Антон Равейка вясной. — Лета яшчэ няхай прабудзе, а восенню прададзім. Я нават сена назапашваць не стану.

— Як гэта, у вёсцы ды без каровы?! Мы ж не якія там здыхлікі, усяго па шэсцьдзесят тры гады маем, — не згадзілася Маруся.

— Вось іменна, што па шэсцьдзесят тры. Я амаль сорак гадоў на трактары адпрацаваў, ды яшчэ сваю гаспадарку трымаем. Як настане лета, то свету белага не бачыў. Таму і рукі баляць, — высокі сівавалосы мужчына быў абураны да глыбіні душы.

— А я тым часам на курорце сядзела?

— Не сядзела, а магла б. Хоць цяпер можам куды-небудзь паехаць, свет паглядзець. Мы ж ні ў адным сталічным тэатры не былі. Усё жыццё як мышы пад венікам... Цемната! У Мінску вунь оперны тэатр адрамантавалі, кажуць, такая прыгажосць! Настаўнікі ездзілі, то захапляліся.

— Калі і збудзем карову, то застануцца свінні, куры, качкі. Пра які тэатр ты пляцеш? Гаспадарку трэба даглядаць. У вёсцы не да тэатраў.

— Глупства, усё залежыць ад чалавека. Некаторыя і ў сталіцы жывучы ніколі там не былі, а некаторыя і з вёскі трапяць. Я каб цябе не слухаў, то даўно наведаў бы і оперны, і Купалаўскі, і ўсе астатнія. Сыну дапамагаць не трэба, ён, жывучы ў сталіцы, добра зарабляе, мае кватэру.

— Годзе! Я нават гаварыць пра гэта не хачу! — тоўстая, як капа, Маруся бразнула дзвярамі і пайшла з хаты.

І яму сядзець не выпадала, бо трэба было сустрэць з пашы карову, занесці свінням, пакуль яна калупалася ў градах, уладкаваць іншыя гаспадарчыя справы.

Калі ўсё было зроблена і яны павячэралі, Антон выйшаў на ганак пакурыць. Над вёскай Букаты стаяў цёплы вечар з пахам ліпавага цвету.

«Ну і ўпартая баба! — думаў пра Марусю. — Толькі і ведае, што таптацца ў хляве ды агародзе. Ні газет не чытае, ні кніг, хоць мае вышэйшую адукацыю. Усё жыццё працавала ў калгасе бухгалтарам. Бывае, у які серыял удолбаецца і вачэй не зводзіць, хоць там адна пустата. Колькі разоў казаў: давай купім камп`ютар. Толькі хмыкне і адвернецца. Ні пагаварыць з ёй пра што, ні параіцца...»

Прыйшоўшы ў хату, прапанаваў:

— А давай збудзем усю гаспадарку, купім у райцэнтры кватэру.

— Тады што, і гурок, і памідор, і бульбіну — усё будзем з кірмашу насіць, за ўсё плаціць?

— Ну і будзем, яно ж такое таннае, што на кірмашы, што ў магазіне.

— Здурнеў на старасці гадоў!

— Тады так: падзелім грошы, якія ёсць, і я сабе куплю кватэру. Калі ты не хочаш, адзін пераеду ў райцэнтр.

— А хоць у Амерыку! Насмяшыш людзей...

— Няхай смяюцца, каму смешна. Я па-другому жыць хачу, на свеце ж столькі цікавага...

Яны і сапраўды прадалі карову, сабралі грошы, якія былі, і Антон купіў у Ліпцах аднапакаёвую кватэру. Маруся наадрэз адмовілася ехаць разам, то навошта яму тая двухпакаёўка.

Калі крыху абжыўся на новым месцы, пазваніў сыну, каб узяў білет у оперны тэатр.

Мінуў тыдзень, і ён, затаіўшы дыханне, пераступіў парог велічнага будынка. Давалі оперу Расіні «Севільскі цырульнік». Ён чытаў лібрэта, з захапленнем глядзеў на зал і не мог паверыць, што нарэшце апынуўся ў гэтым цудоўным храме мастацтва. Неўзабаве дзівосная музыка запаланіла яго душу. «Які ж я быў дурны, што раней сюды не прыехаў! Столькі страціў у жыцці!»

Антон тыдзень пажыў у сына, паняньчыўся з аднагадовым унукам Арсенькам, пабываў у музеях, нават у карціннуюгалерэю пад Палацам Рэспублікі сходзіў.

— Прыязджайце яшчэ, — запрасіла нявестка Вера. — Калі будуць гастролі якой маскоўскай знакамітасці, я вазьму білеты і сходзім разам, а Арсеньку тата пагдзядзіць. Праўда, Вадзім?

— Пагляджу, канешне.

Праз нейкі час маскоўскія артысты прывезлі ў Мінск спектакль «Юнона і Авось», на які Вера ўзяла білеты. Але схадзіць удвох не ўдалося, бо ёй тэрмінова трэба было паехаць на Магілёўшчыну: моцна захварэла бабуля.

— Тата, схадзіце адзін, — прапанавала. — Пойдзеце крыху раней, пастаіце на ганку, і ў вас купяць лішні білецік. Не сумнявaюся, што людзі будуць пытаць.

— А як не будуць і ён прападзе?

— Ну і няхай прападае, каб большай бяды не было.

Ён не прастаяў і трох хвілін, як пра білет спытала пажылая дама ў прыгожым убранні. І калі даведалася, што ёсць, вельмі абрадавалася:

— Ведаеце, я ніколі не прапускаю гастролі маскоўскіх артыстаў. І нашых беларускіх люблю. З маладосці хаджу ў тэатры.

— Шчаслівая! — міжволі вырвалася ў Антона.

— У гэтым сэнсе так.

У якім сэнсе яна нешчаслівая, кабета тлумачыць не стала, але калі пасля спектакля выйшлі на вуліцу, сказала, што тры гады як аўдавела, дзяцей не мае. Працавала дзіцячым доктарам, цяпер на пенсіі.

Антон расказаў пра сябе.

— І я асаблівага шчасця не зведаў, душа была як у цямніцы і вось нарэшце вырвалася на волю. Я так мару пабываць у Маскве ў Траццякоўскай галерэі, з`ездзіць у Санкт-Пецярбург у Эрмітаж...

— Ну дык давайце праз пару дзён з`ездзім у Маскву? Я там вучылася, добра ведаю горад.

— Надзея Сяргееўна, дзякуй вам! Пабуду ў Траццякоўцы, а потым у Эрмітажы, то і паміраць можна...

— Жыць трэба, а не паміраць. Мы з вамі яшчэ шмат дзе пабудзем...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Афиша

Слонимский драмтеатр

7 июля, воскресенье

Спектакль для детей «День рождения кота Леопольда», начало в 12.00, цена 4 руб.

Для взрослых премьера «Незваный гость», начало в 17.00, цена 7 руб.

Городской парк

6 июля, суббота

Народное гулянье «Купальские забавы», начало в 19.00

Слонимский центр культуры и отдыха

Кинозал

3 июля, среда

11.00, 13.00 «История игрушек 4» 3D (США, 6+, мультфильм, 1 ч 40 мин)

15.00, 19.00 «Битва за Землю» 2D (США, 2019, 16+, фантастика, 1 ч 49 мин)

17.00, 21.00 «Проклятие Аннабель 3» 2D (США, 2019, 18+, ужасы, 1 ч 46 мин)

4 июля, четверг

12.00 «Норм и несокрушимые: Большое путешествие» 2D (6+, мультфильм, 1 ч 30 мин)

14.00, 18.30, 21.00 «Человек-паук: Вдали от дома» 3D (США, 16+, фантастика, 2 ч 09 мин)

16.30 «Проклятие Аннабель 3» 2D

5 июля, пятница

11.30, 18.30, 21.00 «Человек-паук: Вдали от дома» 3D

14.00 «Норм и несокрушимые: Большое путешествие» 2D

16.00 «Проклятие Аннабель 3» 2D

6 июля, суббота

12.00 «Норм и несокрушимые: Большое путешествие» 2D

14.00, 18.30, 21.00 «Человек-паук: Вдали от дома» 3D

16.30 «Проклятие Аннабель 3» 2D

7 июля, воскресенье

12.00 «Норм и несокрушимые: Большое путешествие» 2D

14.00, 18.30, 21.00 «Человек-паук: Вдали от дома» 3D

16.30 «Проклятие Аннабель 3» 2D

За главного редактора Николай Николаевич Кононович

Учредитель Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 2 июля 2019 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 2992

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362